# ЗАКЛЮЧЭННЕ

савета па абароне дысертацый Д 09.01.01 пры ўстанове адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» па дысертацыі Канстанцінавай Таццяны Леанідаўны «Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва.

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якіх присуджаецца ісканая вучоная ступень**

Савет па абароне доктарскіх (кандыдацкіх) дысертацый Д 09.01.01 пры ўстанове адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» пацвярджае адпаведнасць дысертацыі Канстанцінавай Таццяны Леанідаўны галіне навукі «мастацтвазнаўства» і спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне пастаўленай праблемы з адзнакай яго значнасці**

Дысертацыя ўпершыню раскрывае функцыянальную, тыпалагічную і арэальную спецыфіку песеннага кампанента паўночнабеларускіх віншавальных абходаў каляндарна-абрадавага цыкла, сістэмаўтваральную функцыю абходаў і сезонную дынаміку іх тыпаў у земляробчай абраднасці Паўночнай Беларусі; даказвае глыбінныя сувязі этнамузычнай культуры Беларускага і Рускага Паазер'я, што склала аснову для рэалізацыі канцэпцыі музычнай арэалогіі ў галіне народна-песенных традыцый, якую можна кваліфікаваць як асабісты ўклад саіскальніка ў айчынную этнамузыкалогію.

**Фармулёўка канкрэтных навуковых вынікаў (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), ЗА якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

– *комплекснае* раскрыццё абходна-песенных традыцый у каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі і выяўленне функцыянальнай дыферэнцыяцыі калядных і велікодных абходных рытуалаў беларускай Поўначы;

– устанаўленне *арэальнай спецыфікі* песеннага кампанента паўночнабеларускіх віншавальных абходаў, абумоўленай крос-рэгіянальным характарам арэалаў калядных і валачобных напеваў, і характарыстыку ладаінтанацыйных адзнак напеваў як цэментуючага фактара і сферы канцэнтрацыі лакальных стылістычных праяў абходна-песеннай традыцыі;

– стварэнне актуальнай *тыпалогіі* паўночнабеларускіх абходных напеваў: комплексу іх асноўных версій (3 калядных, 4 валачобных), лакальных разнавіднасцей і падгруп у кантэксце тыпаў абходных рытуалаў (абкружэнне, наведванне), іх функцыянальных разнавіднасцей (ахоўных, прадуцыравальных, сацыяльна-рэгламентуючых, катарсічных і інш.), што стала тэарэтычным базісам разгляду феномена рытуальнага абходу ў культуры земляробчых народаў Еўропы;

– распрацоўку інтэгратыўнай музычна-арэалагічнай *метадалогіі* ў галіне этнамузыкалогіі, якая спалучае адначасова музычны і этнаграфічны падыход да песенна-абрадавых традыцый, функцыянальную і музычна-стылістычную характарыстыку напеваў, картаграфаванне іх тыпаў, гісторыка-культурную інтэрпрэтацыю арэалаў;

– *аргументацыю* абходных песенна-віншавальных традыцый заходнедзвінскага правабярэжжа (паўночная Віцебшчына і паўднёвая Пскоўшчына) як цэласнай архаічнай сістэмы, што сведчыць пра глыбінныя сувязі этнамузычнай культуры Беларускага і Рускага Паазер'я.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання**

Вынікі дысертацыі могуць стаць метадалагічнай асновай і тэарэтычнай базай навуковых пошукаў у этнамузыкалогіі і іншых галінах народазнаўства, выкарыстоўвацца ў спецыяльных курсах Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі («Музычны фальклор», «Беларускі музычны фальклор», «Беларуская народная музычна-інструментальная культура», «Нотная транскрыпцыя музыкі вуснай традыцыі», «Методыка выкладання музычна-гістарычных дысцыплін»), пры распрацоўцы стратэгіі і мерапрыемстваў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Старшыня савета па абароне дысертацый Д 09.01.01,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар — М. В. Шыманскі

Вучоны сакратар савета,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт — В. С. Царык

21.11.2025